УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”

# ГУСЕЎ МІКАЛАЙ ІВАНАВІЧ

**МАСТАК, СЯБРА САЮЗА МАСТАКОЎ СССР**

**29 ЛІСТАПАДА 1899 Г. – 14 ЛЮТАГА 1965 Г.**

**ФОНД № 170**

**ВОПІС № 1 (ПРАЦЯГ)**

**[1924–1925]–1978 гг.**

МІНСК 2025

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1 (працяг) ф. 170**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ДАКУМЕНТЫ М.І. ГУСЕВА | 51-58 | 1 |

## Прадмова

**Гусеў Мікалай Іванавіч** нарадзіўся 29 лістапада 1899 года ў сям'і селяніна ў вёсцы Метліна[1] Мсцёрскай воласці Вязнікаўскага павета Уладзімірскай губерні Расійскай імперыі (цяпер – межы горада Вязнікі Уладзімірскай вобласці Расійскай Федэрацыі). У 1912 годзе скончыў вясковую школу, у 1916 годзе – Мсцёрскае іканапіснае вучылішча. У ліку лепшых выпускнікоў быў накіраваны на навучанне ў Петраградскае іканапіснае вучылішча. У 1917 годзе – пасля ліквідацыі вучылішча ў выніку Лютаўскай рэвалюцыі – вярнууся ў Мсцёру. Увесну 1918 года сям'я Гусевых паехала да сваякоў у Барнаул. Па дарозе з-за пашырэння фронту іх параход быў спынены на прыстані Ялова Асінскага павета Пермскай губерні. Да восені Гусевы жылі ў вёсцы Асінаўка Асінскага павета Пермскай губерні і працавалі на палях у мясцовых сялян. Увосень з набліжэннем фронту М.І. Гусеў добраахвотна запісаўся ў 1-ы Камскі полк 5-й дывізіі Чырвонай Арміі. У студзені 1919 года – лістападзе 1920 года быў пісарам у гаспадарчай частцы 258 стралковага Камскага палка, затым – мастаком у палітаддзеле 5-й дывізіі. У 1921 годзе – пачатку 1923 года працаваў у Віцебску: загадчыкам бібліятэкі, настаўнікам клуба 7-х пяхотных курсаў, мастаком клуба 15 стралковага палка. Дэмабілізаваўся ў траўні 1923 года, восенню быў прыняты на другі курс Віцебскага мастацкага тэхнікума (вучыўся адначасова з З.І. Азгурам і А.А. Бембелем, адным з выкладчыкаў быў В.В. Волкаў). Пасля сканчэння тэхнікума ў 1926 быў прыняты на аддзяленне жывапісу ў Ленінградскую Акадэмію мастацтваў (пазней пераіменаваную ў Вышэйшы мастацка-тэхнічны інстытут). У сакавіку 1928 года па ўласным жаданні пераехаў у Мінск для працы ў Беларускім дзяржаўным выдавецтве. У 1929 годзе вярнуўся для навучання на графічна-выдавецкім факультэце таго ж інстытута (прераведзенага з Ленінграда ў Маскву і рэарганізаванага ў Маскоўскі паліграфічны мастацка-тэхналагічны інстытут (цяпер – Маскоўскі дзяржаўны ўніверсітэт друку імя Івана Фёдарава) і скончыў яго ў 1932 годзе. Адразу за тым быў прызначаны загадчыкам мастацкай часткі (у 1936–1937 гадах – кансультантам) у Беларускае дзяржаўнае выдавецтва ў Мінску, адначасова выконваў абавязкі загадчыка сектара выяўленчага мастацтва Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР. З 1939 года – да чэрвеня 1941 года кіраваў гуртком малюнка і акварэлі пры Саюзе савецкіх архітэктараў у Мінску, быў членам рэдкалегіі часопіса "Іскры Ільіча". Падчас акупацыі жыў у Мінску. З канца 1940-х гадоў – да 1965 года выкладаў (з 1963 года – быў загадчыкам кафедры малюнка, акварэлі і скульптуры) у Беларускім політэхнічным інстытуце (цяпер – Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт). У 1948–

[1] Існуе разыходжанне ў датах і месцы нараджэння М.І. Гусева: у яго аўтабіяграфіі падаецца 29 лістапада 1899 года і вёска Метліна (БДАМЛМ, Ф. 170, Воп. 1, Спр. 37, Л. 1.), у артыкуле "Гусеў Мікалай Іванавіч" падаецца "9 (21).12.1899" і "былая в. Петрына" ("Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва" ў 5-і тамах. Т.2. / Пад рэд. І.П. Шамякіна і інш. – Мінск: выдавецтва "Беларуская савецкая энцыклапедыя" імя Петруся Броўкі, 1985, С. 237).

1950 гадах вучыўся на аддзяленні працаўнікоў мастацтваў у Вячэрнім універсітэце марксізма-ленінізма пры Мінскім Гаркаме КП(б)Б.

З 1924 года браў удзел у мастацкіх выставах. З 1932 года – сябра Саюза савецкіх мастакоў БССР. Працаваў у жанрах сюжэтна-тэматычных карцін: “У ліцейнай майстэрні” (1929), “М.І. Калінін праводзіць войскі на польскі фронт. Мінск. 1919 год” (1940), “Штаб Мінскага партызанскага злучэння” (1946), “Янка Купала і Ян Райніс” (1959) і інш.; і партрэта: А.А. Бембеля і А.К. Глебава (абодва – кан. 1940-х гадоў), Я. Купалы (1949), П.Ф. Глебкі (1958), П.У. Броўкі і Р.Р. Шырмы (абодва – 1960) і інш.

Мікалай Іванавіч Гусеў памёр 14 лютага 1965 года. Пахаваны на Усходніх могілках у Мінску.

Дакументы М.І. Гусева паступілі ў БДАМЛМ ад яго ўдавы Тамары Сцяпанаўны Гусевай у 1989 годзе. У выніку навуковага апісання быў складзены вопіс № 1 (працяг), у які ўвайшлі 8 спраў (33 дак.) за [1924–1925]–1978 за гады.

Гэта творчыя дакументы М.І. Гусева, яго пісьмы да родных, пісьмы знаёмых да Т.С. Гусевай (удавы), фотапартрэты П.У. Броўкі і Р.Р. Шырмы. Справы сістэматызаваны па відах дакументаў, унутры відаў – па храналогіі.

Прадмову склала
заг. аддзела В.Ф. Шаталава
01.11.2024

Установа "Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва"

ФОНД № 170
ВОПІС № 1 (працяг)
[1924-1925]-1978

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пратакол ЭМК БДАМЛМ
ад 09.01.2025
№ 1

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. ДАКУМЕНТЫ М.І. ГУСЕВА** | | | | |
| 51 Нест. | М.І. Гусеў. Мужчынскі і жаночы партрэты, партрэт сына. Крокі.<br>Папера, аловак.<br>На адвароце Л. 1 - выява мужчыны, які сядзіць (аловак) [1924-1925] | [1924-1925] - 1947 | 3 | 3/4 | |
| 52 Нест. | М.І. Гусеў. Партрэты дачкі Інты, медыцынскай сястры, жанчын і хлопчыка.<br>Ватман, папера, аловак, каляровыя алоўкі.<br>На адвароце Л. 5 - накід кампазіцыі (аловак) [кан. 1950-х гг.] | 1943 - [кан. 1950-х гг.] | 5 | 5/6 | |
| 53 Нест. | М.І. Гусеў. Жаночы партрэт.<br>Ватман, акварэль | [др. пал. 1940-х -1950-я гг.] | 1 | 1 | |
| 54 Нест. | М.І. Гусеў. Партрэты камісара партызанскай брыгады "Буравеснік" Мінскай вобласці І.М. Рабухі і неўстаноўленага савецкага вайскоўца.<br>Ватман, папера, акварэль, алоўкі | [др. пал. 1940-х гг. - да 1952 г.] | 2 | 2 | |
| 55 Нест. | М.І. Гусеў. "Строимся". Сюжэтна-тэматычная карціна.<br>Холст, алей | [1947] | 1 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 56 | Пісьмы М.І. Гусева да Т.С. Гусевай (жонкі), дачкі Інты і інш. | 1949-1960 | 25 | 17 | |
| | *** | | | | |
| 57 | Пісьмы сям'і Жураўлевых да Т.С. Гусевай (удавы) са спачуваннямі з-за смерці М.І. Гусева і з яго згадкай.<br>Адно - з адначасным зваротам да дачкі Зоі, другое - да дачкі Зоі і сына Мікалая | 1965, 1978 | 2 | 2 | |
| | *** | | | | |
| 58 | Фотапартрэты П.У. Броўкі і Р.Р. Шырмы (для напісання іх патрэтаў) | [1960] | 2 | 2 | |

У дадзены раздзел вопісу № 1 (працяг) унесена 8 спраў (33 дакументы) з № 51 па № 58, у тым ліку:
літарныя нумары
прапушчаныя нумары

Усяго ў вопіс уключана 58 спраў з № 1 па № 58, у тым ліку:
літарныя нумары
прапушчаныя нумары

Вопіс склала і апрацоўку
фонду зрабіла:
заг. аддзела ____________ В.Ф. Шаталава
2025

Дакументы прынялі:
заг. аддзела забеспячэння ____________ В.І. Бярэйшык
захаванасці дакументаў

"_____"____________20____ г.